**Список использованных источников**

1. Баева Г. М. История фундаментальной библиотеки АН БССР (1925–1941 гг.) / Г. М. Баева // Из истории книги, библиотечного дела в библиографии в Белоруссии. – Мн., 1970.

2. Баева Г. М. Из истории фундаментальной библиотекиАН БССР (1941–1959 гг.) / Г. М. Баева, В. Б. Филипских // Библиотечное дело и библиография в системе библиотек Академии наук БССР : сб. ст. / редкол.: Г. М. Баева, И. И. Ваксер и др. – Мн., 1976. – С. 11.

3. Durandus Guilelmus. Rationale divinorum officiorum / Durandus Guilelmus. – Argentina [Strassburg], 1484.

4. ЦНБ НАН Беларуси Ф.30 "Пширков Ю. С.", оп.1 ед. хр.№ 738. с.36.

5. Берков П. Н. О людях и книгах / П. Н. Берков. – М., 1965. – С. 26.

6. Черняева А. И. Библиотека члена-корреспондента АН СССР П. Н. Беркова / А. И. Черняева // Библиотечное дело и библиография в системе библиотек Академии наук БССР : сб. ст. – Мн., 1976. – С. 49.

7. Архив дирекции Императорских театров. Вып. 1, отд. 1–2. – СПб., 1892.

8. Денисенко Е. П. Издания из библиотеки Л. Ю. Кроля (по материалам книжного собрания из фондов отдела редких книг и рукописей ЦНБ НАН Беларуси) / Е. П. Денисенко // Информационное обеспечение науки Беларуси : сб. науч. ст. – Мн., 2004. – С. 166.


## Презентация

# КАЛЕКЦЫЯ ЛАЦІНАМОЎНЫХ ВЫДАННЯЎ XV–XVII СТАГОДДЗЯЎ АБ БЕЛАРУСІ Ў ФОНДАХ ЦЭНТРАЛЬНАЙ НАВУКОВАЙ БІБЛІЯТЭКІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ


***Абухоўская Тацццяна Міхайлаўна,*** *навуковы супрацоўнік аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;*

***Сынкова Ірына Анатольеўна,*** *кандыдат філасофскіх навук, навуковы супрацоўнік аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*


Лацінская мова пасля краху Рымскай імперыі адыграла вялікую ролю ў культуры Заходняй Еўропы, будучы мовай рэлігійнага культу і адукацыі. У немалой ступені дзякуючы ёй, была створана адзіная духоўная прастора, у якой цесна спляталіся культурныя лёсы асобных краін. Літаратура на лацінскай мове была зразумелай для адукаваных людзей ва ўсіх кутках Еўропы. Адзіная канфесійная прыналежнасць да рымска-ка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таліцкай царквы і адзіная сістэма адукацыі ўмацоўвалі заходнееўрапейскі ўніверсум і, нягледзячы на заўсёдныя спрэчкі і канфлікты паміж дзяржавамі, сфармавалі на працягу тысячагадовага Сярэдневечча своеасаблівую хрысціянскую цывілізацыю.

У перыяд Рэнесанса развіццё лацінскай мовы атрымала значны імпульс. Новы навуковы рух – гуманізм – стаў у авангардзе культурнага жыцця Еўропы. У аснове гуманістычных штудыяў ляжала класічная філалогія: дасканалае вывучэнне старажытных моў, даследаванне антычных твораў, развіццё метадаў навуковай крытыкі тэкстаў. Праз гэта вярталіся да новага ўжытку духоўныя скарбы Старажытнай Грэцыі і Рыму. Гуманісты ачышчаюць латынь ад сярэдневяковых “варварызмаў” і свае творы пішуць, узяўшы за ўзор мову знакамітых пісьменнікаў і паэтаў Рыма. Пачынаецца апошні ўзлёт лацінскай літаратуры, яе “залатая восень”.

Але менавіта ў перыяд Рэнесанса пачынаецца працэс станаўлення нацыянальных культур Еўропы, які ў моўнай сферы адзначаецца ўзнікненнем нацыянальных літаратурных моў. Гэта паступова прыводзіць да выцяснення латыні з мастацкай літаратуры, публіцыстыкі, але яна яшчэ доўга захоўвае свае пазіцыі ў галіне навуковай літаратуры. Таму і на пачатку Новага часу, у XVII–XVIII стст., з’яўляецца шмат розных твораў на лацінскай мове.

У аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі захоўваюцца вельмі цікавыя выданні XV–XVIII стст. на лацінскай мове, якія змяшчаюць звесткі пра Беларусь. Іх можна падзяліць на дзве катэгорыі: юрыдычныя і наратыўныя помнікі.

Юрыдычныя помнікі, якія з’яўляюцца адным з відаў дакументальных гістарычных крыніц, ўяўляюць з сябе зборы законаў, каралеўскіх загадаў, сеймавых пастаноў і т.п. У нашу калекцыю ўваходзяць:

– Statuta Regni Poloniae in ordinem alphabeti digesta a Joanne Herburto de Fulstin… Samoscii [Zamość] : Martinus Lenscius typ. Academiae excudebat, [1597] (“Статуты Каралеўства Польскага, размешчаныя ў алфавітным парадку...”, выданне якіх было падрыхтаванае Янам Гербуртам) і перавыданне 1620 г. гэтага збору.

– Statuta Serenissimi domini D. Sigismundi Primi, Poloniae Regis, Magni Ducati Lituaniae… Somosci [Zamość] : Martinus Lenscius, Typographus Academiae, excudebat, 1602 (“Статуты святлейшага гаспадара Жыгімонта Першага, Караля Польскага, Вялікага Князя Літоўскага...” (два асобнікі).

Гэты від крыніц даволі добра вядомы і часта выкарыстоўваецца даследчыкамі.

Сярод наратыўных помнікаў таксама можна вылучыць дзве групы твораў – па паходжанні аўтараў: жыхароў Рэчы Паспалітай (“позірк знутры”) альбо прадстаўнікоў іншых краін Заходняй Еўропы (“позірк збоку”).

Да першай групы належаць такія гістарычныя творы, як:

– Chronica, sive Historiae Polonicae compendiosa … authore magnifico viro Ioanne Herburto de Fulstin. Basileae [Basel] : Ex officina Oporin-

iana, [1571] ("Хроніка, альбо Скарочаная гісторыя Польшчы..." Яна Гербурта).

– Respublica sive status regni Poloniae, Lituaniae, Prussiae, Livoniae diversorum autorum. Lugduni Batavorum [Leiden] : ex officina Elzeviriana, 1627 ("Дзяржава, альбо Лад каралеўства Польскага, Літоўскага, Прускага, Лівонскага паводле розных аўтараў"). Тут цікавая інфармацыя змяшчаецца ў главах V («Аб паходжанні народа і звычаяў Літвы, з "Еўрапейскай Сармацыі" Аляксандра Гваніні») і VI ("Наконт Літвы, з фрагментаў Міхалона Ліцвіна"). Адзін з аўтараў, Аляксандр Гваніні (Alexandr Guagnini) – польскі гісторык італьянскага паходжання. Прымаў удзел у бітвах у перыяд праўлення Жыгімонта Аўгуста і Стэфана Баторыя. Вывучыў польскую мову, звычаі і правы Рэчы Паспалітай. Польшчу лічыў другой радзімай. Напрыканцы жыцця апынуўся ў Кракаве, дзе і памёр у 1614 г. У Эльзевіраўскі збор 1626 г. увайшоў скарочаны варыянт яго "Sarmatiae Europeae descriptio...".

Другі аўтар – Міхалон Ліцвін – гуманіст і мысліцель XVI ст., прадстаўнік шляхты, аўтар сацыяльна-палітычнага трактата на латыні "Аб норавах татараў, літоўцаў і маскавіцянаў".

– Effata regum Poloniae, usque ad Ioannem Casimirum a Nicolao de Chwaikowo Chwaikowski ... collecta. Varsaviae [Warszawa] : Typis Collegii Scholarum piarum, 1694 ("Выказванні польскіх каралёў..." Мікалая Хвалкоўскага). Аўтар – пісьменнік, які жыў у часы праўлення Яна III. Вучыўся на радзіме і потым у Франкфурце над Одэрам. Па вяртанні з Германіі быў узяты на службу князем Курляндскім Якавам на пасаду саветніка. Праславіўся як вучоны сваімі творамі.

– Historia arcana, seu Annalium polonicorum libri VII Casimiri Zawadzki. Cosmopoli [Frankfurt], 1699. ("Тайная гісторыя, альбо Польскія аналы ў VII кнігах" Казімежа Завадскага). Аўтар – гісторык. Прымаў удзел у палітычным жыцці. Займаўся сучаснай гісторыяй, смела і ў вострых выразах выказваўся ў выдадзеных творах наконт гвалту і парушэння правоў у краіне, за што нават быў прыцягнуты да адказнасці.

– Historia Vladislai Poloniae et Sueciae principis... Auctore Stanislao a Kobierzycko Kobierzycki. Dantisci [Gdańsk] : Sumptibus Georgii Forsteri, 1655 ("Гісторыя Уладзіслава, прынца Польскага і Шведскага..." Станіслава Кабежыцкага). Аўтар – польскі гісторык і дзяржаўны дзеяч. З 1647 г. быў каштэлянам Гданьскім, а ў 1656 г. стаў ваяводам Паморскім. Вельмі адукаваны, ён вылучаўся выдатным стылем, за які яго параўноўвалі з Лівіем. Памёр у 1665 г.

– Victor et victus Vincentius Corvinus Gosiewski... A Samuele Weslawski. Vilnensi [Wilno], 1691 ("Пераможца і пераможаны Вінцэнт Корвін Гасеўскі..." Самуэля Венслаўскага). Аўтар, натарыус Яна Казіміра, таксама быў сябрам Гасеўскага (Гансеўскага). Разам з гетманам ён апынуўся ў палоне ў Маскве і быў сведкам падзей, якія і апісаў.

– Bellum Scythico-Cosacium Seu De Conjuratione Tartarorum, Cosacorum, et plebis Russiae contra Regnum Poloniae... Authore Ioachimo Pastorio. Dantisci [Gdańsk] : sumptibus Georgij Försteri, 1652 ("Пра Скі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фа-казацкую вайну, альбо Пра змову татараў, казакаў і рускага народу супраць Польскага каралеўства...” Іяхіма Пасторыя).

– Historiae Lituanae Pars prior… Auctore P. Alberto Wijuk Koialovicz, Dantisci [Gdańsk] : sumptibus Georgij Försteri, 1650 (“Першая частка гісторыі Літвы...” Войцэха Каяловіча).

– Monumenta sarmatarum, viam carnis ingressorum… Simone Starovolscio, primicerio Tarnoviensi collectore. Cracoviae [Kraków] : In officina viduae et haeredum Francisci Caesarii, 1655 (“Сармацкія помнікі...” Шымона Старавольскага). Складальнік – адзін з вядомых беларускіх пісьменнікаў XVII ст. Атрымаў адукацыю ў Кракаўскай акадэміі. Вучыўся таксама ў розных еўрапеўскіх акадэміях. Пасля вяртання на радзіму пачаў выкладаць філасофію і тэалогію.

– Chronica gestorum in Europa singularium a Paulo Piasecio… Cracoviae [Kraków] : In Officina Typographico Franciscii Caesarii, 1645 (“Хроніка надзвычайных у Еўропе падзей…” Паўла Пясецкага). Аўтар – гісторык, пачатковую адукацыю атрымаў у Кракаўскай Акадэміі, працягваў навучанне ў Празе, потым у Рыме, дзе прабыў чатыры гады і прыняў духоўны сан. Яго “Хроніка” пачынаецца ад выбрання на трон караля Стэфана Баторыя і заканчваецца 1645 г.

У першую групу наратыўных помнікаў уваходзяць таксама некалькі гісторыка-рэлігійных твораў:

– Дзве кнігі Анджэя Венгерскага: Systema historico-chronologicum, Ecclesiarum Slavonicarum per provincias varias, praecipue, Poloniae, Bohemiae, Lituaniae, Russiae, Prussiae, Moraviae etc. distinctarum… Opera Adriani Regenvoloscii E. P. Trajecti ad Rhenum [Utrecht] : Ex Officina Johannis a Waesberge, 1652 (“Гісторыка-храналагічная сістэма славянскіх цэркваў…”); Andreae Wengerscii libri quattuor Slavoniae reformatae, continens historiam ecclesiasticam Ecclesiarum Slavonicarum, Inprimis Polonicarum, Bohemicarum, Lithuanicarum, Russicarum, Prussicarum, Moravicarum etc… Amstelodami [Amsterdam] : Apud Janssonio-Waesbergios, 1679 (“Рэфармаванае славянства…”). У гэтым творы гаворка ідзе пра гісторыю хрысціянства ў Еўропе, у тым ліку ў Польшчы і на Беларусі. Аўтар ведаў і выкарыстоўваў як надрукаваную літаратуру, так і рукапісы (не захаваліся).

– Propositiones Christianopoliticae, unitati et pietati animorum, bello et paci, universae Christianitatis accomodae. Authore Christophoro Stanislao … Zawisza. Cracoviae [Kraków] : Typis Vniversitatis, 1695. (“Асноўныя палажэнні хрысціянскай палітыкі…” Кшыштафа Завішы). Аўтар – ваявода Мінскі. Атрымаў адукацыю спачатку ў Віленскай, а потым у Кракаўскай акадэміі. Прымаў актыўны ўдзел у падзеях свайго часу. Пісаў паэтычныя творы і палітычныя трактаты на польскай мове і на латыні. У гэтым творы сярод разважанняў на агульныя тэмы сустракаюцца кароткія звесткі пра гістарычныя падзеі на Беларусі, або пра дзяржаўных дзеячоў.

Да другой групы належаць наратыўныя помнікі замежных аўтараў – г. зн. разнастайныя творы, якія змяшчаюць цікавую інфармацыю гістарычнага, геаграфічнага, культурна-этнаграфічнага характару.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольш раннім выданнем з'яўляецца інкунабул : Hartmann Schedel. Liber cronicarum cum figures et ymaginibus ab initio mundi usque nostrum temporis. Nürnberg, 1493 ("Сусветная хроніка" Гартмана Шэдэля). Гэты твор уяўляе з сябе тыповы ўзор жанру гістарычных твораў, вельмі папулярнага ў Сярэднявеччы і ў перыяд Рэнесанса. Працы такога кшталту, як "Сусветная хроніка", традыцыйна з'яўляліся кампіляцыямі. "Хроніка" Шэдэля змяшчала не толькі кароткі пераказ біблійных апавяданняў і агляд старажытнай гісторыі, але і раздзелы, прысвечаныя сучасным падзеям у розных краінах Еўропы. Двойчы ў сваёй кнізе згадвае аўтар "Сарматыю" – Рэч Паспалітую.

У XVI–XVII стст. сталі вельмі папулярнымі геаграфічныя творы. Яны змяшчалі ў сабе разам са звесткамі пра ландшафт, клімат, асаблівасці флоры і фауны ў той ці іншай краіне таксама гісторыка-культурную інфармацыю пра аўтахтоннае насельніцтва. Прыкладам такога кшталту твораў з'яўляецца Epitome trium terrae partium, Asiae, Africae et Europae…Tiguri [Zürich], 1534 ("Кароткае апісанне трох частак свету" Вадыяна). Нямецкае імя аўтара – Іяхім фон Ват (Joachim von Watt). Ён з'яўляўся выдатным швейцарскім гуманістам, медыкам і вучоным, грамадскім дзеячам і рэфарматарам. Значная частка яго жыцця была звязана з Венай – рэзідэнцыяй нямецкага імператара Максіміліяна і культурнай сталіцай усёй Свяшчэннай Рымскай імперыі на пачатку XVI ст. У раздзеле, прысвечаным Сарматыі, ён апісвае Польшчу і Вялікае княства Літоўскае (ВКЛ).

Кніга Іягана Баэма Mores, leges et ritus omnium gentium per Ioannem Волmum Aubanum, Teutonicum, ex multis clarissimis rerum scriptoribus collecti (Lugduni, apud Ioannem Tornaesium et Gul. Gazeium, 1556) – "Звычаі, законы і рытуалы ўсіх народаў" – была ў свой час любімым чытаннем амаль для ўсёй Еўропы. У раздзелах "Пра Русь, альбо Рутэнію" і "Пра Літву" змяшчаецца інфармацыя пра насельніцтва Беларусі.

У калекцыі старадрукаў ЦНБ НАН Беларусі знаходзяцца два прыжыццёвыя выданні "Масковіі" А. Пасевіна з апісаннем яго падарожжа ў Рэч Паспалітую і Масковію (Antonii Possevini S.J. Moscovia. Vilnae, in Lituania apud Ioannem Velicensem, 1586; Antonii Possevini Moskovia, et, lia opera…[Köln] : in officina Birckmannica, sumptibus Arnoldi Mylij, 1587). Аўтар, езуіт і актыўны дзеяч царквы, паспяхова сумяшчаў дзейнасць у галіне шпіянажу і дыпламатыі. У адрозненне ад твораў вышэйзгаданых аўтараў, якія абапіраліся часцей за ўсё на звесткі з другіх рук, кніга Пасевіна грунтуецца на асабістых уражаннях і назіраннях. Асобныя фрагменты аповеду тычацца ВКЛ і складаюцца з апісаняў прыроды, гарадоў і звычаяў насельніцтва.

Да XVII ст. належаць два творы С. Нойгебаўэра: Historia rerum Polonicarum concinnata et ad Sigismundum tertium Polniae Sueciaeque regem usque deducta"… a Salomone Neugebauero a Cadano. Hanoviae [Hanau], sumptibus Danielis et Davidis Aubriorum, nec non Clementis Schleichii, 1618 ("Злучаная гісторыя Польшчы..."); Icones et vita principum ac Regum Poloniae omnium. Adornatae atque Collectae a Solomone



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Neugebauero de Cadano. Francofurti ad Moenum [Frankfurt/Main] : In Bibliopolio Jacobi de Zetter. Typis Hartm. Paltheny, 1620 ("Выявы і жыццяпісы ўсіх князёў і каралёў Польшчы"). Аўтар – гісторык, родам з Прусіі. Першы яго твор з'яўляецца кампіляцыяй з прац Кромера, Вапоўскага, Бельскіх, Ажэхоўскага і Гедэнштэйна.

Gestorum glorissimi ac invictissimi Vladislavi IV Poliniae et Sveciae regis. Authore Everhardo Wassenbergio Embricensi. Gedani [Gdańsk] : Typis Hunefeldianis, 1641 ("Дзеянні найслаўнейшага і самага непераможнага Уладзіслава IV, караля Польскага і Шведскага" Эверхард Васенберг). Аўтар – нямецкі гісторык, у Польшчы стаў каралеўскім гістарыёграфам. Выкарыстоўваў матэрыялы з прац розных аўтараў.

Некалькі твораў XVII ст. уяўляюць з сябе агульныя апісанні розных краін свету, сярод якіх згадваюцца Рэч Паспалітая і ВКЛ:

– Georgi Horni Orbis imperans. Lugduni Batavorum [Leiden], apud Felicem Lopes de Haro, 1668 ("Кола дзяржаў" Георга Хорна).

– Politicarum Dissertationum de Statu Imperiorum, Regnorum, Principatuum et Rerumpublicarum… Opera et studio Nicol Belli editi. Francofurti [Frankfurt] : apud Schönwetter, 1615 ("Пра дзяржаўны лад імперый, каралеўстваў, княстваў і рэспублік…" Ніколя Бэлі).

– Lucae de Linda Descriptio Orbis et omnium ejus rerumpublicarum... Lugduni Batavorum [Leiden] : Apud Petrum Leffen, 1655 ("Апісанне свету і ўсіх яго дзяржаў..." Лукі дэ Лінда).

Сярод згаданых твораў знаходзяцца кнігі знакамітых еўрапейскіх выдавецтваў і друкарняў: Эльзевіраў, Фёрстэра, Біркмана і інш.

Некаторыя выданні XV–XVII стст. не толькі вельмі цікавыя па змесце, але таксама з'яўляюцца помнікамі кніжнага мастацтва. Так, у віленскім выданні "Масковіі" А. Пасевіна прыгожыя застаўкі і канцоўкі ў выглядзе віньетак, элегантныя ініцыялы цудоўна гарманіруюць з карункавым курсіўным шрыфтам кнігі. Цікавыя ксілаграфічныя канцоўкі і ініцыялы розных памераў аздабляюць базэльскае выданне гэтага твору.

1809 гравюр М. Вольгемута і В. Плейдэнвурфа зрабілі "Сусветную хроніку" Шэдэля самай багата ілюстраванай кнігай XV ст.

У выданнях XVII ст. часта з'яўляюцца тытульныя гравюры. Напрыклад, назва кнігі Gestorum glorissimi ac invictissimi Vladislavi IV змяшчаецца ў рэнесансавым партале; зверху – партрэт Уладзіслава IV. Алегарычныя выявы на калонах партала адлюстроўваюць перамогі караля.

Гравюра на тытульным аркушы Effata regum Poloniae … a Nicolao de Chwałkowo Chwałkowski паказвае пасяджэнне сейма. Аўтар гравюры – Караль Дэлаэй (Carol de la Haye).

Шмат ксілаграфічных партрэтаў польскіх каралёў і літоўскіх князёў знаходзіцца ў кнізе Icones et vita principum ac Regum Poloniae omnium.

Некаторыя кнігі захавалі арыгінальныя пераплёты (XV–XVII стст.). Многія з іх зробленыя з пергамену, але, на жаль, часта яны знаходзяцца ў кепскім стане. Асобныя экземпляры ўяўляюць вельмі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

распаўсюджаны ў эпоху Рэнесанса (асабліва на тэрыторыі Германіі, Чэхіі, Венгрыі) тып пераплёту: светлая скура (часта – свіная) галыновага дублення з блінтаваным цісненнем. Такія пераплёты ў Польшчы называюцца ягелонаўскімі.

Такім чынам, разгляданая калекцыя з'яўляецца не толькі зборам выдатных помнікаў гістарычнай думкі, але і звяртае на сябе ўвагу з пункту гледжання гісторыі кнігі.

# МУЗЫЧНА-ПЕДАГАГІЧНАЯ ЛІТАРАТУРА Ў ЕЎРОПЕ І НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У XVI–XVIII СТСТ.

***Кузьмініч Мікалай Леанідавіч,*** *кандыдат педагагічных навук, першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў*

Важным крокам на шляху да станаўлення музычнай адукацыі ў Еўропе з'явілася распачатае ў эпоху Адраджэння кнігадрукаванне. Першыя музычна-педагагічныя працы (школы, кіраўніцтвы, дапаможнікі, падручнікі, указанні) не ў поўнай меры адлюстроўвалі ўсё багацце педагагічнай практыкі, цэласны творчы працэс выканання музычных твораў. Асобныя моманты выканальніцкай практыкі абсалютаваліся, і, адпаведна, вырашэнню гэтых праблем надавалася асноўная ўвага ў музычна-педагагічных трактатах. Аўтары канцэнтравалі ўвагу на асобных прыватных пытаннях, распрацоўвалі іх павярхоўна, без адпаведнай сістэматызацыі. Па-за іх увагай заставаліся важнейшыя прынцыповыя моманты – заканамернасці музычна-педагагічнага працэсу. Пісьмовая музычная педагогіка ў гэты час толькі пачынала свой рух па шляху аналізу і абагульнення педагагічнай і выканальніцкай практыкі, дзеля таго, каб стаць у далейшым здольнай да глыбокіх навуковых абгрунтаванняў і высноў.

Найбольш вядомымі арганна-клавірнымі школамі ў эпоху позняга сярэднявечча, у 2-й палове XVI ст., былі іспанская і італьянская. У гэты час выйшлі трактаты іспанскіх музыкантаў Х. Бермуда "Разважанне аб музычных інструментах" (1555) і Т. дэ Санкта Марыі "Мастацтва выканання…" (1565). Вядомым помнікам італьянскага арганна-клавірнага мастацтва эпохі Адраджэння з'яўляецца трактат Дж. Дзіруты "Трансільванец" (1593). У ім выкладзены правілы натацыі і іншыя звесткі, неабходныя арганісту.

У XVII ст. адбываецца размежаванне арганнага (царкоўнага) і клавірнага (свецкага) мастацтваў. Першая з вядомых прац, прысвечаных уласна клавесіну, – "Трактат аб настройцы спінета…" (Францыя, 1650). Пытанні методыкі навучання, рэалізацыі індывідуальнага падыходу да вучня, выхавання любові да музыкі знайшлі адлюстра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ